# «І ўсё ж для роднай Беларусі хачу застацца я паэтам...»

*І ні вясной, і ні зімой*
*Упрочкі песні не збяжыць.*
*Душа мая і голас мой*
*Увершах застануцца жыць.*

*Язэп Пушча*

***У гісторыі беларускай літаратуры Язэп Пушча, 120 гадоў з дня нараджэння якога споўнілася сёлета, пакінуў яскравы і адметны след, запамінальныя вобразы, арыгінальныя вершы і паэмы. Яго ўнікальны стыль, нечаканыя метафары, эксперыменты з рытмікай, блізкасць да народных песень і музыкальнасць мовы прыцягваюць увагу сучасных чытачоў, літаратуразнаўцаў, кампазітараў, а спадчына паэта складае мастацкую каштоўнасць нашай літаратуры.***

Язэп Пушча (сапраўднае імя Іосіф Паўлавіч Плашчынскі) нарадзіўся 20 мая ў 1902 г. у вёсцы Каралішчавічы непадалёк Мінска ў сялянскай сям'і. Яго бацькі, Павел Вікенцьевіч і Міхаліна Вікенцьеўна, былі непісьменнымі, працавалі на гаспадарцы і выхоўвалі шасцёра дзяцей – чатырох сыноў і двух дачок. Іосіф, ці па-вясковаму Язэп, быў пятым дзіцём, адным з малодшых у гэтай вялікай сям'і. Жыццё Плашчынскіх напаўнялі тыповыя для сялян працоўныя будні, дзе ў кожнага з дзяцей з малых гадоў былі свае абавязкі.

Гаспадарка ў Плашчынскіх была добрая: мелі тры каровы, авечак, свіней, коней. Хлапчуком Язэп уставаў з узыходам сонца і ішоў на выган пасвіць кароў, *«слухаў у полі і чуў, як раніца рыкае»*. Невыпадкова гэты вобраз вясковай раніцы ўвайшоў у вершы будучага паэта. Былі ў хлопца і іншыя абавязкі: праца на зямлі, жніво, касьба... Ураженні пра гэты час пакінуў сам Язэп Пушча ў сваёй аўтабіяграфіі, якая захоўваецца ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ): *«Я рана навучыўся араць і касіць, і ў дванаццаць гадоў у касьбе амаль не адставаў ад дарослых, хоць фізічна і не быў моцным хлапчуком, але да касьбы здатным»*. З дзяцінства Язэпа захапілі мелодыі жніўных песень, якія паўплывалі на яго раннюю творчасць, прыўнеслі ў вершы асаблівую пявучасць і мілагучнасць.

Бацькі хлапчука не мелі магчымасці вучыцца самі, але дзяцей імкнуліся вывесці ў людзі. У восем гадоў Язэп пайшоў вучыцца ў мясцовае народнае вучылішча. У пачатку XX ст. Каралішчавічы былі вялікім населеным пунктам, тут пражывала больш за тысячу жыхароў. Вёска, вядомая яшчэ з XVI ст. і названая ў гонар аднаго са шляхціцаў Прушынскіх, якія мелі тут сядзібу, была заможнай і прыцягвала культурную эліту краю. Вядома, што ў мясцовым касцёле Апекі Маці Божай некаторы час служыў арганістам Станіслаў Манюшка.

Вучобу ў жніўні 1914 г. перапыніла Першая сусветная вайна, і юны Язэп *«пачынаў адчуваць душой народнае гора»*, якое яна несла. Праз год ён паступіў у другі клас Мінскага вышэйшага пачатковага вучылішча, але першыя занятку адбыліся толькі ў канцы 1915 г. Тут у Язэпа пачалося зусім іншае, самастойнае жыццё. Мікола Хведаровіч у сваёй кнізе нарысаў «Незабыўнае» пісаў: *«за некалькі дзесяць вёрст малому хлопцу даводзілася хадзіць дадому па харчы кожны тыдзень»*, бо жыў Язэп на прыватнай кватэры ў раёне цяперашняй Серабранкі. Вучоба ў Мінску раскрыла перад здольным, дапытлівым вучнем новыя магчымасці, дала новыя знаёмствы. Менавіта тут ён прачытаў сваю першую беларускую кніжку, зборнік «Шляхам жыцця» Янкі Купалы, дзякуючы якому, *«купалаўскае слова абудзіла ў яго нацыянальную свядомасць»*. З 1918 па 1921 г. ён працягваў адукацыю ў Мінскім рэальным вучылішчы. У гэты ж перыяд у Каралішчавічах ён пазнаёміўся з Міхасём Чаротам і пасябраваў з ім на доўгія гады.

Пасля заканчэння вучылішча Язэп вярнуўся ў родныя Каралішчавічы, дзе пачаў працаваць настаўнікам у мясцовай школе. Школа была невялікая, а вучняў 80 чалавек, таму занятке праходзілі ў дзве змены, бо Плашчынскі быў адзіным педагогам. Ніякіх планаў і праграм навучання ў нядаўна створанай школе не было, з аддзела народнай асветы не хто не наведваў, працу настаўніка не правяралі і на ўроках не прысутнічалі. Скарыстаўшыся такой свабодай, малады педагог пачаў выкладаць на беларускай мове, *«ды яшчэ ўвёў нямецкую і французскую мовы, бо толькі што скончыўшы рэальнае вучылішча, больш-менш ведаў іх»*. З гэтага часу настаўніцкая справа прайшла праз усё жыццё Язэпа Пушчы.

У жніўні 1921 г. па ўласным жаданні Іосіф Плашчынскі быў накіраваны ў Мінск на курсы беларусазнаўства пры Наркамасвеце БССР. Цікавыя лекцыі па літаратуры, сустрэчы з пісьменнікамі, сярод якіх Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, натхнілі маладога настаўніка. Упершыню Іосіф Плашчынскі спрабуе пісаць вершы.

Скончыўшы курсы, настаўнік атрымаў званне лектара і пачаў працаваць у Мазырскім, а пасля Мінскім аддзелах народнай асветы, дзе выкладаў беларускую мову і літаратуру на агульнаадукацыйных курсах, курыраваў школьную адукацыю.

У 1922 г. у друку з'яўляюцца першыя вершы Язэпа Пушчы пад псеўданім Лясун. У розныя гады ён карыстаўся шэрагам псеўданімаў і крыптанімаў: П. Радзецкі, Чытач, З. Ж., Я. Кудзер, Л. Трыер, выкарыстоўваў і сваё сапраўднае прозвішча. Псеўданім «Язэп Пушча» з'явіўся прыкладна ў 1923 г., калі ён стаў сябрам «Маладняка» і друкаваўся ў аднайменным часопісе. Паэт нездарма ўзяў такі псеўданім, бо вельмі любіў лес. *«Нешта піша, дык прозвішча новае прыдбаў... Усе ў нас Плашчынскія, а ён Пушча»*, – па-вясковаму прости і шчыра тлумачыў Вінцэнты, старэйшы брат пісьменніка.

У 1923 г. Язэп пазнаёміўся з маладымі беларускімі паэтамі – Анатолем Вольным, Андрэем Александровічам, Алесем Дударам, Адамам Бабарэкам і інш. У гэты час адбылася памятная ў гісторыі беларускай літаратуры падзея: адным з лістападаўскіх вечароў у клубе «КІМ» сябры-пісьменнікі, сярод якіх быў Язэп Пушча, вырашылі арганізаваць літаратурнае аб'яднанне «Маладняк».



**Язэп Пушча ў 1922 – 1923 гг. (з фондаў БДАМЛіМ)**

У 1925 г. у серыі «Кніжніца Маладняка» выйшаў першы зборнік вершаў Язэпа Пушчы «Раніца рыкае». У ім навідавоку захапленне ясенінскімі традыцыямі, маладая задзірыстасць, бадзёрасць і жыццясцвярджальнасць, імкненне да кожнай з'явы прыроды знайсці сваё непаўторнае вобразнае тлумачэнне. Цудоўна перадаў свае ўражанні пра зборнік Сяргей Грахоўскі: *«Толькі два словы – раніца рыкае, а ўяўленне ўжо малявала туманнае світанне, тужлівыя гукі пастуховай берасцянкі, ёй адказвалі рыкам каровы, бегучы на стойла з двара. Жыла ва ўсіх колерах, гуках і пахах вясковая раніца. Вось тады і зразумеў, што побач пастаўлены дакладныя словы могуць тварыць цуд, што гэта і ёсць паэзія»*.

Язэп працягваў выкладаць беларускую мову і літаратуру на агульнаадукацыйных курсах. Каштоўныя ўспаміны пра гэта пакінуў Алесь Звонак, які ў юнацтве быў слухачом тых курсаў: *«Ён загаварыў. Пачалася лекцыя. Голас у яго быў мяккі, крыху пявучы, мова таксама прыгожая, павольная, лёгкая, як плынь тае рэчкі, што працякае паблізу ягo роднага сяла, як лёгкі пошум вясновы ў маладым гаі... Так, прынамсі, нам здавалася. Можа, таму і палюбіліся нам яго лекцыі, яго нетаропкая апавядальная манера выкладання, яго мяккі гумар і поўная адсутнасць уладных інтанацый, гэтага неад'емнага атрыбута настаўніцкай прафесіі...»*.

Гэты час быў напоўнены не толькі плённай настаўніцкай працай, радасцю творчасці, але і каханнем. У верасні 1925 г. Язэп Пушча разам з Кузьмой Чорным наведалі Слуцк, дзе прымалі ўдзел у літаратурным дыспуце разам з іншымі маладнякоўцамі слуцкай філіі. Тут малады паэт сустрэў васемнаццацігадовую Станіславу Шпакоўскую, з якой звязаў свой лёс назаўжды. Крануальныя, рамантычныя ўспаміны пра гэту сустрэчу пакінула сама Стася: *«Мы былі зачараваны Пушчавымі вершамі. Так мне і стаіць уваччу: мілы, сціплы, сарамлівы, з такой цудоўнай усмешкай... <...> Праз два дні Пушча і Чорны паехалі ў Мінск. Я вельмі сумавала. Не ведала, куды сябе дзець. Напэўна, я пакахала па-сапраўднаму»*.

Закаханыя пабраліся шлюбам ў 1925 г. і пачалося іх сумеснае жыццё, іх *«цудоўныя "Дні вясны", хоць была ўжо восень»*. Станіслава стала сапраўдным сябрам мужа, яго падтрымкай, заўсёды была побач пры любых жыццёвых абставінах. Плашчынскія стварылі цудоўную сям'ю, выхавалі чатырох дзяцей: Галіну, Валерыю, Лідзію і Анатоля. Паэт прысвяціў жонцы шмат вершаў, поўных цеплыні і пяшчоты, а дзеці натхнілі яго на стварэнне вершаваных казак, кранальных «Лістоў да дачушак».

За першым дэбютным зборнікам адзін за адным выходзяць наступныя кнігі паэта, сярод якіх «Vita» (1926) і «Дні вясны» (1927). Язэп Пушча надаваў шмат увагі дакладнасці назваў раздзелаў у сваіх выданнях, шукаў ёмістыя загалоўкі для стварэння «архітэктанічнай стройнасці». У вершах мяняецца светаўспрыманне паэта, ён нібы прадчувае свой нязросты лёс.

Паступова некаторыя сябры «Маладняка» пачалі яго «перарастаць», бо імкнуліся да творчага росту, пошукаў індывідуальнага стылю, да іншага разумення прызначэння літаратуры. Адбываецца «раскол» творчай суполкі. 26 мая 1926 г. было створана новае літаратурнае аб'яднанне – «Узвышша». Разам з Уладзімірам Дубоўкам і Адамам Бабарэкам Язэп Пушча стаў адным з яго заснавальнікаў.

Пушча працягваў вучыцца: у 1925 г. паступіў на педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, але восенню 1927 г. перавёўся ў Ленінградскі ўніверсітэт на аддзяленне мованазнаўства і матэрыяльнай культуры.



**Язэп Пушча, Уладзімір Дубоўка, Андрэй Александровіч у 1924 – 1925 гг. (з фондаў БДАМЛіМ)**

У Ленінградзе пісьменнік піша творы, якія сталі для яго лёсавызначальнымі і прарочымі: «Лісты да сабакі» (1927), паэмы «Песня вайны» (1927 – 1928) і «Цень Консула» (1928), зборнік «Песні на руінах» (1929). У іх адлюстраваны ўражанні паэта ад падзей Першай сусветнай, грамадзянскай, савецка-польскай войнаў, рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Перад вачыма юнака праходзіла гісторыя, карэнным чынам мянялася жыццё, і ён творча адгукаўся на ўсё, што бачыў і адчуваў. Ужо самі назвы надзвычай гаварыя, сімвалічныя, і некаторыя ўспрымалі іх як выклік грамадству. Пачалася хваля жорсткай крытыкі...




**«Vita» (1926 г.)**

У 1929 г. пісьменнік пакінуў вучобу ў Ленінградзе і вярнуўся ў Мінск, працаваў стыльрэдактарам у Белдзяржвыдавецтве, стварыў паэмы «Крывавы плакат» (1930) і «Сады вятроў» (1930). Пушча спрабаваў тлумачыць крытыкам крыніцы свайго суму ў «ленінградскіх» творах тугой па радзіме, адарванасцю ад родных каранёў, адзначаў, што *«імкнецца выйсці на светлую дарогу»*, *«на шырокія прасторы вялікай паэзіі»*. Аднак гэта не ўратавала яго.

Язэп Пушча быў арыштаваны 24 ліпеня 1930 г. З 1931 па 1958 г. жыў у выгнанні, спачатку ў горадзе Шадрынску, што на Урале, пасля ў Анапе, а потым у сяле Чаадаева на Мурамшчыне. За гэты час ён паспеў папрацаваць бухгалтарам у Шадрынскім райлесгасе, нарыхтоўчай канторы і нават у аддзеле вінаробства ў саўгасе «Джэмэтэ». Сваю творчасць пісьменнік прыпыніў, у аўтабіяграфіі ён піша коратка: *«працую бухгалтарам і зрэдзь звяртаюся да паэзіі»*, *«працую бухгалтарам, напісаў некалькі вершаў»*.

Язэп Пушча адчуў сябе свабодным, калі пачаў займацца любімай настаўніцкай справай: выкладаў рускую мову і літаратуру ў Манакоўскай сярэдняй школе з 1937 па 1941 год. Тут ён вярнуўся да горада жыцця. Яго паважалі калегі, а вучні ўспрымалі як надзейнага сябра, якому давяралі. Іосіф Паўлавіч меў сапраўдны педагагічны талент, умеў зацікавіць нават самых абыякавых да вучобы школьнікаў. Захаваліся дакументы, што сведчаць пра паспяховую працу Іосіфа



*Сям'я Язэпа Пушчы. Верасень 1957 г. З фондаў БДАМЛіМ*

Паўлавіча ў Манакоўскай школе: даведка аб грашовай прэміі ў 200 рублёў, характарыстыка, дзе адзначана, што дзякуючы яму паспяховасць у некаторых класах складала 96,6 %.

З 1941 па 1958 г. пісьменнік з сям'ёй жыў у сяле Чаадаева Мурамскага раёна, працаваў дырэктарам мясцовай сярэдняй школы. Гэтыя гады сталі самымі паспяховымі ў яго настаўніцкай рабоце. Захаваліся ўспаміны паплечнікаў і вучняў Іосіфа Плашчынскага, прасякнутыя павагай і цеплынёй да яго. Яго калега, настаўніца Яўгенія Шустава згадвала: «*Іосіф Паўлавіч валодаў нейкім дзіўным талентам арганізатара. Ён быў не мітуслівы, не шумлівы, заўсёды спакойны, вытрыманы. Часам здавалася, што ён ніякіх асаблівых намаганняў не прыкладае, каб вырашыць нейкае складанае пытанне. Знешне выглядала так, быццам усё рабілася само сабой. Але варта было прыгледзецца ўважліва, і ўбачыш, што Іосіф Паўлавіч заўсёды ў цэнтры ўсіх пачынанняў…*».



Ліст да дачушак

Ў дачушак міленькіх
~~Ёсць мама й дзедзе;~~
Па любых, маленькіх
І тата прыедзе.
Ён Галю і Лялю
З сабою пасадзіць:
Прытуліць, пахваліць,
Галоўкі пагладзіць;
І тушкі-птушкі
Зьлятуцца ў хату.
Мае вы дачушкі,
Цалуе вас тата,
Тата Язэп

1938

Язэп Пушча быў дбайным гаспадаром, сам рамантаваў школьныя парты і дзверы, уразаў замкі, даглядаў прышкольны ўчастак, нават пасадзіў разам з вучнямі вішнёвы сад. Любіў займацца ўласным агародам. У Плашчынскіх заўсёды жылі каты і сабакі, яны абзавяліся каровамі, козамі, курамі.

У гады вайны пісьменнік быў мабілізаваны і некаторы час праходзіў вучобу ў 2-м Маскоўскім пяхотным вучылішчы, але з-за стану здароўя вярнуўся да сваіх дырэктарскіх абавязкаў. Чаадаева не замяніла паэту радзіму, але гэты край, любімая школа і калегі назаўжды засталіся ў яго сэрцы і на старонках яго кніг.

Язэп Пушча быў рэабілітаваны 30 студзеня 1956 г., у 1958-м – вярнуўся з сям'ёй у Мінск, дзе ім выдзелілі кватэру на вуліцы Чарнышэўскага, аднак толькі 6 гадоў было адведзена паэту пражыць на радзіме. За гэты кароткі перыяд ён шмат паспеў, быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў, пабачыў надрукаванымі свае кнігі. Як успамінае Станіслава Плашчынская: «*У гэты час ён вельмі шмат пісаў. Уставаў рана і да снядання любіў паблукаць адзін па лясных сцяжынках. Часам прыходзіў з лесу і тут жа садзіўся за стол і пісаў. Прыходзіў такі свежы, адпачыўшы, усхваляваны*».

Пісьменнік звяртаецца да дзіцячых твораў. Адным з іх стала вершаваная казка «На Бабрыцы», што пабачыла свет у двух асобных выданнях – 1960 і 1977 гг. з ілюстрацыямі Валянціна Ціхановіча.

У апошнія гады жыцця Язэп Пушча цяжка хварэў. Ён памёр 14 верасня 1964 г. Паводле яго жадання пахавалі паэта на яго роднай зямлі – на вясковых могілках побач з бацькамі ў Каралішчавічах.

У межах праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала вялікую віртуальную экспазіцыю да юбілею Язэпа Пушчы. Сярод каштоўнасцяў рэсурсу – алічбаваныя прыжыццёвыя выданні паэта, матэрыял пра ўшанаванне яго памяці, поўныя тэксты артыкулаў сучасных пушчазнаўцаў. Заслугоўвае ўвагі маштабны раздзел «Фотагалерэя», створаны з дапамогай фондаў партнёраў праекта: Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Раздзел прадстаўляе шэраг фотаздымкаў і выяў асабістых рэчаў пісьменніка, яго рукапісы і запісныя кніжкі, віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы, лісты і дакументы.

Імя Язэпа Пушчы застаецца «*светлым праменьчыкам*» у паэзіі Беларусі, а яго вершы пакідаюць адчуванне цеплыні, прыроднага хараства і лёгкага смутку:

*Клёны з ліпамі схіляцца ніц*
*І асвеціцца зорамі дзень.*
*Мой апошні акорд празвініць, –*
*Даль прыцісне яго да грудзей.*

**Юлія АМОСАВА**